## Заданні да рэгіянальнай (вытворчай) практыкі

## (2 курс: 27.06–23.07)

За час практыкі студэнты **павінны**:

1. Вывучыць структуру рэдакцыі.
2. Падрыхтаваць да друку не менш 4–5 аўтарскіх матэрыялаў у інфармацыйных жанрах (нататкі, рэпартажу, інтэрв'ю, справаздачы і інш.).
3. Падрыхтаваць да друку 1–2 аўтарскія публікацыі ў аналітычных жанрах (карэспандэнцыі, артыкула).
4. Зрабіць 2–3 макеты палос газеты.
5. Прымаць удзел у вычытцы матэрыялаў.
6. Дзяжурыць па нумары газеты.
7. Прымаць удзел у рэдакцыйных планёрках і лятучках,
8. Выязджаць у камандзіроўкі, удзельнічаць у арганізацыйна-масавай працы рэдакцыі (рэйд, "круглы стол" і інш).

## Формы прадстаўлення студэнтамі справаздачнай дакументацыі

У вызначаны тэрмін пасля завяршэння практыкі студэнт прадстаўляе кіраўніку-метадысту **наступную справаздачную дакументацыю**:

– творчую характарыстыку, падпісаную рэдактарам выдання і завераную пячаткай рэдакцыі;

– справаздачу аб практыцы. У ёй таксама ўказваецца спецыфіка выдання, у якім студэнт праходзіў практыку, аспекты сумеснай работы з кіраўніком практыкі ад рэдакцыі, удзел ва ўнутрырэдакцыйнай і масавай дзейнасці газеты. Справаздача павінна ўтрымліваць таксама аналіз пазітыўных і негатыўных бакоў работы рэдакцыі, разбор найбольш адметных эпізодаў уласнай практычнай работы, роздум аб творчых знаходках і пралiках, назіранні за спецыфікай рэдакцыйных будняў, за работай вопытных журналістаў, заўвагі і пажаданні па арганізацыі практыкі.

– дзённік практыкі (пішацца ў адвольнай форме);

– апублікаваныя творчыя працы (у выпадку істотнай праўкі – арыгіналы работ, што дасць магчымасць меркаваць аб ступені апрацоўкі матэрыяла ў рэдакцыі);

– копіі прынятых да друку, але не апублікаваных пакуль матэрыялаў, завераныя пячаткай рэдакцыі і подпісам рэдактара;

– самастойна зробленыя макеты палос;

– паласу з самастойна праведзенай карэктурай.

– спіс публікацый у электронным выглядзе

Уся дакументацыя павінна быць падшытая ў папцы з афармленым тытульным лістом і вопісам змешчаных дакументаў.

**ТЭРМІН ЗДАЧЫ ДАКУМЕНТАЦЫІ – 25 ЛІПЕНЯ 2016**